**КАТАЛЕ́КТЫКА** (ад грэч. katalēktikōs канцавы), тэрмін традыцыйнай стопнай метрыкі, які абазначае супадзенне або несупадзенне заканчэння вершаванага радка са стапой. Вершаваны радок, у якім апошняя стапа прадстаўлена цалкам (г.зн. па колькасці складоў яна не адрозніваецца ад папярэдніх стоп), называецца акаталектычным (*ямб* і *анапест*, якія завяршаюцца націскным складам). Напр., 2-стопны ямб «Было тады: // Сяло, сады. // Цвілі гады // Нібы сады» (Я.Сіпакоў); пяцістопны анапест «Беларусь — мая маці і мова, паветра і хлеб! // Гэта ўзважана сэрцам на нервах расстайных дарог» (А.Вялюгін). Калі ў вершы апошняя стапа радка ўсечана на 1 ці 2 ненаціскныя склады, ён называецца каталектычным, або ўласна К. У *амфібрахіі* ці *харэі* К. можа быць на 1 склад, у *дактылі* — на 1 ці 2 склады. Напр.: «Ты яшчэ не хмеліш галавы, // Лёгкі чад купальскае травы» (Р.Семашкевіч). У тэорыі л-ры сустракаецца таксама тэрмін «гіперкаталектыка», або «гіперкаталектычны верш». Такі верш утвараецца ў тым выпадку, калі апошняя стапа мае на 1 ці некалькі

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ненаціскных складоў больш, чым папярэднія стопы free вершаванага радка. Напр.: «Рыфмаў больш не знаходзілі, // Апроч «хлопцы» ды «стопцы» (К.Камейша). Сучасныя навукоўцы падобнай класіфікацыяй вершаваных стоп амаль не карыстаюцца. Звычайна вершазнаўцы ўказваюць на характар *клаўзул* у вершаваным радку (дактылічныя, гіпердактылічныя, мужчынскія ці жаночыя).

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова